УДК 656.7.03

# АЦЭНКА ТАРЫФАЎ НА МІЖНАРОДНЫЯ ПАСАЖЫРСКІЯ АВІЯПЕРАВОЗКІ

*Блахіна Марыя Уладзіміраўна,*
*навуковы кіраўнік, канд.тэхн.навук Ан.Паўловіч*
*(Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт)*

Апісаны розныя віды тарыфаў на міжнародныя пасажырскія авіяперавозкі і выканана спроба аналізу сыстэм тарыфаў. Прыводзяцца рэкамендацыі для аптымізацыі кошту перавозкі.

Развіццё рынку авіяперавозак адбываецца сінхронна з развіццём сістэм авіятарыфаў, якія яшчэ недастаткова даследаваны. Апішам тыя віды тарыфаў, што выкарыстоўваюцца найбуйнейшымі авіякампаніямі.

*Тарыфы Міжнароднай Асацыяцыі Авіяперавозчыкаў* - базісныя тарыфы, усталяваныя дзеля выкарыстання любой авіякампаніяй, адкрытыя для ўсіх, прыводзяцца ў розных сістэмах браніравання.

*Адкрытыя тарыфы* авіякампаній - тарыфы на дадзены кірунак ад дадзенага перавозчыка, узгодненыя з Міжнароднай Асацыяцыяй Авіяперавозчыкаў.

*Закрытыя тарыфы* авіякампаній - тарыфы на дадзены кірунак ад дадзенага перавозчыка, вызначаюцца попытам і ўзроўнем канкурэнцыі менавіта на дадзеным кірунку ды ў дадзены перыяд, з’яўляюцца камерцыйным сакрэтам кампаніі.

Усе тры адзначаныя віды тарыфаў бываюць поўныя (або нармальныя) і ільготныя.

*Поўныя (або нармальныя) тарыфы* – тарыфы за поўны кошт, карыстанне імі не цягне за сабою накладання спецыяльных абмежаванняў на перавозку.

*Ільготныя тарыфы* – тарыфы, ніжэйшыя за поўныя тарыфы; альбо для любога пасажыра, альбо для пасажыраў

пэўных катэгорый; карыстанне імі цягне за сабою накладанне пэўных абмежаванняў на перавозку. Найбольш часта выкарыстоўваюцца наступныя ільготныя тарыфы, што разлічаныя на любога пасажыра:

*Экскурсійныя тарыфы.* Агаворваецца тэрмін дзейнасці білета, а таксама мінімальны тэрмін прысутнасці ў краіне прызначэння.

*Кругасветныя тарыфы.* Выкарыстоўваецца альянсамі авіякампаній; маюцца абмежаванні на працягласць і пункты маршрута, нумары рэйсаў, абавязковасць вяртання ў пункт вылету.

*Сезонныя тарыфы.* Выкарыстоўваецца ў перыяды сезоннага спада попыту на перавозкі; маюцца абмежаванні на колькасць месцаў на кожны рэйс, тэрміны і даты выкарыстоўвання.

*Рэкламныя тарыфы.* Абмежаванні рознага характару, прычым цяжка прадказальныя.

Ільготныя тарыфы для пасажыраў пэўных катэгорыяў (патрабуецца пацвердзіць прыналежнасць да адпаведнай катэгорыі пасажыраў) маюць разнавіднасці ў залежнасці ад адрасата:

*Пенсійны тарыф.* Для сталых асобаў (звычайна ад 55 - 60 гадоў).

*Кампаньёнскі тарыф.* Для арганізаваных груп пасажыраў; патрабуецца адначасовая рэгістрацыя дадзенай групы.

*Шлюбны тарыф.* Зніжка даецца на аднаго з сужонцаў; абмяжоўваецца тэрмін дзейнасці білета.

*Сямейны тарыф.* Зніжка даецца на аднаго з бацькоў і на малагадовых дзяцей; абмяжоўваецца тэрмін дзейнасці білетаў.

*Моладзевы тарыф.* Для маладых асобаў (звычайна да 25 гадоў); абмежаванні рознага характару і ў залежнасці ад краіны.

*Школьны тарыф.* Для груп навучэнцаў школ і іншых навучальных установаў (звычайна да 19 гадоў) і кіраўніка; абмежаванні вызначаюцца спецыяльнымі правіламі.

*Дзіцячы тарыф.* Для дзяцей (звычайна ад 8 да 12 гадоў) без суправаджэння.

З улікам вышэй прыведзенага адзначым наступнае:

- не існуе адзіных тарыфаў на міжнародныя авіяперавозкі пасажыраў;
- арганізацыі і кампаніі прапануюць кліентам для перавозкі розныя сістэмы тарыфаў, якія цягам часу развіваюцца і ўскладняюцца;
- кошт перавозак паводле дзеючых сістэм тарыфаў мяняецца як у часе, так і ў прасторы (у залежнасці ад кірунку і адлегласці перавозак);
- спажыўцу авіяперавозак складана арыентавацца на рынку прапаноў.

Аналіз існуючых сістэм тарыфаў і практыкі іхнага выкарыстання дазваляе сфармуляваць пэўныя правілы аптымізацыі кошту авіяперавозкі:

- перавозку рэкамендуецца планаваць загадзя;
- удакладненне даты і рэйсу выконваецца пасля атрымання ў аператара інфармацыі аб ільготных тарыфах;
- найлепшы вынік будзе дасягнуты пры забеспячэнні перавозкі адной авіякампаніяй;
- звычайна выгадней выконваць перавозку найкарацейшым маршрутам;
- належыць пазбягаць міжнародных разрываў маршрута, а таксама прыпынкаў ў прамежкавых пунктах больш як на суткі.
- трэба актыўна шукаць і стала кантраляваць інфармацыю аб зменах тарыфаў на рынку пасажырскіх авіяперавозак.

**Крыніцы:**


1. www.timatik.ru
2. www.air-dir.com
3. www.regioninfo.ru
4. www.comp-service.ru